# Глава VII. ЭВАЛЮЦЫЯ СУДОВАЙ СІСТЭМЫ

## 7.1. Судовыя ўстановы ў краі (1775–1872 гг.)

*(І. Г. Гушчынскі, А. П. Жытко, С. А. Талмачова)*

У адпаведнасці з «Учреждениями для управления губерний...» 1775 г. была створана сістэма мясцовых судовых устаноў: губернскія палаты крымінальнага і грамадзянскага суда, верхні земскі суд, губернскі магістрат, верхняя расправа, павятовыя суды, гарадавыя магістраты і ратушы, ніжнія расправы; «совестныя» і славесныя суды і інш.

Палаты губернскага крымінальнага і грамадзянскага суда з'яўляліся вышэйшымі агульнасаслоўнымі судовымі інстанцыямі ў губерні[1] для перагляду найбольш значных крымінальных і грамадзянскіх спраў, якія былі вырашаны ў верхнім земскім судзе, губернскім магістраце і верхняй расправе, а таксама судамі 1-й інстанцыі.

У палаце крымінальнага суда праводзіўся разгляд следчых і крымінальных спраў аб злачынствах дваран і гараджан, якія пазбаўлялі абвінавачанага жыцця і гонару, следчыя і крымінальныя справы аб злачынствах (падробках, казнакрадстве, ліхвярстве, падпалах памешчыцкіх маёнткаў, парубках у казённых лясах, справы аб калоднiках). Палата праводзіла рэвізію ўсіх крымінальных спраў верхняга земскага суда.

Палата грамадзянскага суда разбірала справы, якія тычыліся дзяржаўнай казны, цяжбы па пытаннях гарадской уласнасці, аб нерухомай маёмасці на тэрыторыі губерняў, размежаванні паветаў. Скаргі на рашэнні палат уносіліся ў Сенат. Перанос спраў з палат у Сенат забараняўся, калі цяжба па іску складала меней 500 руб. Рашэнні палат па исках да 500 руб. лічыліся канчатковымі. Кожная судовая палата складалася са старшыні, 2 дарадчыкаў і 2 асэсараў, якія прызначаліся Сенатам, а старшыні зацвярджаліся царом.

Пры Паўле I палаты крымінальнага і грамадзянскага судоў у 1797 г. былі аб'яднаны ў адзіны орган – Галоўны суд. У сувязі

[1] ПСЗРИ. Собр. 1-е. – Т. 20 (1775–1780). – № 14392. – С. 231–235.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ